




## ЗАХАВАЕМ РАЗАМ ТВП "АЛЬМАНСКІЯ БАЛОТЫ"!

Калі Вам неабыякавы лёс прыроды роднага краю, калі Вы маеце магчымасць наведваць Альманскія балоты і кантраляваць іх стан або жадаеце іншым чынам садзейнічаць іх ахове, Вы можаце стаць адным з захавальнікаў ТВП "Альманскія балоты" і разам з намі паклапаціцца аб яе існаванні ў будучым.

**Захавальнікам ТВП можа стаць кожны аматар прыроды незалежна ад узросту, прафесіі і асабістых здольнасцей. З дапамогай захавальнікаў мы рэгулярна і аператыўна атрымліваем інфармацыю пра стан ТВП і пагрозы, якія на іх узнікаюць, праводзім практычныя мерапрыемствы для захавання гэтых тэрыторый і аднаўлення экасістэм.**

АБО СКАНІРУЙЦЕ

ЗАХОДЗЬЦЕ НА СТАРОНКУ

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце: 8(017)263-06-13**

**Станавіцеся адным з захавальнікаў, назірайце за Тэрыторыяй, важнай для птушак. Паведамляйце нам пра пагрозы для ТВП і свае назіранні!**


ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"
(8017) 263-06-13
(8029) 223-06-13
(8029) 101-68-87
info@ptushki.org

www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus
www.vk.com/ptushki
www.twitter.com/ptushki

**www.ptushki.org**



Сетка захавальнікаў ТВП "Альманскія балоты" ствараецца ў рамках праекта "Развіццё і ўмацаванне сеткі захавальнікаў вакол значных водна-балотных угоддзяў" пры падтрымцы прыродаахоўнай асацыяцыі "Кааліцыя Чыстая Балтыка".

Фота: В. Дамброўскі, С. Зуёнак, М. Чэркас, T. Krumenacker, www.4x4brest.com


Тэрыторыі, важныя для птушак

# АЛЬМАНСКІЯ БАЛОТЫ





Барадатая кугакаўка



Вялікі арлец

## ШТО ТАКОЕ ТВП?

Найбольш эфектыўным метадам аховы большасці рэдкіх і многіх звычайных відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне каштоўных прыродных тэрыторый, неабходных для іх выжывання.

Тэрыторыя, важная для птушак (ТВП) – гэта тэрыторыя, якая адпавядае міжнародным або нацыянальным крытэрыям падтрымкі пэўнай часткі папуляцыі аднаго ці некалькіх відаў птушак падчас гнездавання, зімоўкі або міграцыі.

Зараз у праграме ТВП удзельнічаюць каля 200 краін свету, у якіх выдзелена больш за 11 000 ТВП. У Беларусі вызначаны 52 Тэрыторыі, важныя для птушак.




## ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА ТВП "АЛЬМАНСКІЯ БАЛОТЫ":

1. Гэта буйнейшы лесабалотны комплекс у Еўропе. Плошча Альманскіх балот – 94 441 га, што складае амаль трэць тэрыторыі Столінскага раёна, дзе яны знаходзяцца.
2. Альманскія балоты захаваліся ў амаль некранутым стане і з'яўляюцца рэзерватам для многіх відаў дзікіх жывёл і раслін. Гэта стала магчымым дзякуючы існаванню тут вайсковага палігона і, як вынік, амаль поўнай адсутнасці гаспадарчай дзейнасці.



3. Двойчы прадпрымаліся спробы стварыць тут запаведнік: у 30-х і 60-х гадах XX ст., але тыя планы не спраўдзіліся. Толькі ў 1998 г. былі створаны аднайменны Рэспубліканскі ландшафтны заказнік. Ён мае міжнародныя статусы ТВП і Рамсарскай тэрыторыі.
4. У Беларусі гняздуецца каля 100 пар глабальна пагражаемага віду – вялікага арляца, што складае 15 % яго еўрапейскай папуляцыі. Найбуйнейшая гнездавая групоўка вялікага арляца ў нашай краіне, каля 25 пар, знайшла прытулак менавіта тут.
5. Кожная пятая беларуская баратая кугакаўка – рэдкая вялікая сава – гняздуецца на Альманскіх балотах. Гэта паўднёвы край яе арэала.
6. На Альманскіх балотах сустракаецца еўрапейская шыракавушка – прадстаўніца рукакрылых. Гэта адзін з некалькіх беларускіх відаў млекакормячых, занесеных у Міжнародную Чырвоную кнігу.



Еўрапейская шыракавушка

## ШТО ПАГРАЖАЕ АЛЬМАНСКІМ БАЛОТАМ?

У апошняе дзесяцігоддзе ахоўны рэжым палігона стаў менш строгім. Будаўніцтва дарог, выкарыстанне сучаснай тэхнікі зрабілі балота больш даступным, і антрапагенны прэсінг узмацніўся. З-за адмоўнага ўздзеяння людзей узніклі пагрозы прыродным экасістэмам заказніка і іх насельнікам:

- пашкоджванне глебавага покрыва сучаснымі транспартнымі сродкамі;



- неабмежаваны збор журавін і некантралюемае паляванне;
- турбаванне людзьмі гняздуючых птушак на астравах, асабліва ў час веснавога збору журавін;
- браканьерская высечка лясоў на астравах і градах сярод балот, рубка старых дрэў для вырабу борцей.

